*Мікола Нікалаеў*

# ЛЬВОЎСКІЯ ВЫДАННІ Ў НЯСВІЖСКАЙ БІБЛІЯТЭЦЫ РАДЗІВІЛАЎ

Адзін з найбольш старажытных і ўплывовых магнацкіх родаў Вялікага Княства Літоўскага Радзівілы (Осцікавічы) у XVI ст. падзяліўся на дзве лініі: пратэстанцкую – біржайскую і каталіцкую – нясвіжскую. Прадстаўнікі абедзвюх канфесій праводзілі розную палітыку, у тым ліку і ў галіне культуры. Характэрнай, аднак, з’явай была верацярпімасць і перавага родавых інтарэсаў для асобаў рознага веравызнання. Як біржайскія, так і нясвіжскія Радзівілы арганізоўвалі друкарні, фінансавалі школы, а гэтым спрыялі развіццю асабістых бібліятэк настаўнікаў і вучняў. Радзівілам часта прысвячалі розныя выданні, у якіх аўтары праслаўлялі мецэнацтва князёў[1].

Пачатак Нясвіжскай замкавай бібліятэкі ўзыходзіць да Мікалая Радзівіла Сіроткі (1549–1616), які не толькі меў уласны багаты кнігазбор, але і па-бібліяфільску аздабляў яго. Кнігазбор Сіроткі папоўнілі кнігі яго бацькі, Мікалая Радзівіла Чорнага, які карыстаўся павагай сярод інтэлектуалаў свайго часу. Па тэстаменце Сіротка пакідаў бібліятэку сыну Яну Юрыю Радзівілу (1583–1625) і яго спадчыннікам з умовай, каб кнігі не былі расцярушаны (“rozproszone nie były”)[2]. У бібліятэцы Польскай Акадэміі навук у Курніку (шыфр Sygn. 1320) захаваўся інвентар Нясвіжскай бібліятэкі, складзены ў 1651 г. бургграфам Нясвіжскага замка Янам Хановічам для Аляксандра Людвіка Радзівіла, сына Сіроткі, нясвіжскага ардыната ў 1636–1654 гг. Інвентар улічвае 743 назвы і складаецца з дзвюх частак. Першая частка (ад № 1 да 501) змяшчае тэматычны перапіс кнігаў па 31 раздзеле. Асаблівасць яе ў тым, што сюды ўключаны кнігі, выдадзеныя пераважна да 1616 г. (г. зн. да смерці Мікалая Сіроткі). Ва ўступе адзначана, что такі – тэматычны – каталог параіў зрабіць Антоній Пасевін. Другая частка інвентара Хановіча пабудавана ў алфавітным парадку (№ 502-743). На аснове гэтага інвентара Тадэвуш Бернатовіч зрабіў спробу рэканструкцыі кнігазбору Мікалая Сіроткі[3]. Для самога гаспадара асабліва каштоўнымі былі выданні, звязаныя з родам Радзівілаў: “Гіпіка” з прысвячэннем Мікалаю Радзівілу Чорнаму, таксама кнігі, якія выпушчаны прафесарам грэцкай мовы і вядомым базэльскім выдаўцом

[1] M. Jarczykowa. Radziwiłłowie Birżańscy i Nieświescy wobec książek w XVI i w pierwszej połowie XVII wieku: Zarys problematyki // *Badania księgozbiorów Radziwiłłów: Materiały międzynarodowej sesji, Olsztyn, 6–7 października 1994 r.* Warszawa, 1995. S. 15-34.

[2] M. B. Topolska. *Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku*. Wrocław, 1984. S. 207.

[3] T. Bernatowicz. “Biblioteka jest jedna ozdoba...”: Mikołaj Radziwiłł Sierotka i książki // *Badania księgozbiorów Radziwiłłów...* S. 43-49.

І. Апорыным, друкарняй базэльскага выдаўца Пятра Перны – з прысвячэннямі яму ж; Радзівілам прысвяціў кнігі паслядоўнік П. Перны – К. Вальдкірх. У гэтым жа шэрагу кнігі Радзівілаў-пісьменнікаў: “Перыгрынацыя” Мікалая Сіроткі, “Latinae...” Караля Радзівіла і інш.

Як выглядалі памяшканні бібліятэкі Нясвіжскага замка ў сярэдзіне XVII ст., дае ўяўленне інвентар 1658 г., складзены пры перадачы спраў Янам Хановічам Людвіку Смятанскаму[4].

Часам радзівілаўскія кнігазборы падзялялі трагічны лёс гаспадароў. Пасля таго, як 30 снежня 1655 г. у Тыкоціне памёр Януш Радзівіл, у яго абозе сярод іншага маёнту засталіся: “скрыня на возе з кнігамі старымі, пісанымі; скрынка доўгая жалезная з кнігамі друкаванымі; шуфляда з кнігамі; дзве шуфляды вялікія з бібліятэкай”. Куды дзеліся гэтыя скрыні і шуфляды – невядома. Брат Януша, Багуслаў Радзівіл, складаў свой тэстамент 27 снежня 1668 г. у Орлі на Падляшшы, недалёка ад Тыкоціна. Кнігазбор ён адпісаў у Кёнігсберг, курфюрсту Брандэнбургскаму. Пры перадачы ў Прускую Каралеўскую бібліятэку кнігі Багуслава Радзівіла атрымалі адмысловы “данацыйны” экслібрыс, а праз некаторы час і друкаваны каталог[5]. Некалькі кнігаў з маляванымі пяром выявамі Радзівілаў і іх подзвігаў Багуслаў завяшчаў перадаць у гароўную родавую бібліятэку – ардынацкую нясвіжскую – на вечнае захаванне[6]. Гаспадаром нясвіжскай ардынацыі ў гэты час быў прадстаўнік каталіцкай галіны роду Радзівілаў Альбрэхт Станіслаў, дзяржаўны канцлер Вялікага Княства Літоўскага, бібліяфіл, дыпламат, рэлігійны пісьменнік[7].

У XVIII ст. гаспадары Нясвіжа працягвалі выдаткоўваць на папаўненне бібліятэкі вельмі значныя сродкі. Так, у лісце да вядомага польскага бібліяфіла Іосіфа Андрэя Залускага Ульрых Радзівіл пісаў: “Я сёння паслаў у Галандыю вексель на дзве тысячы флорынаў на кнігі для маёй бібліятэкі”[8]. Значныя папаўненні зрабіў для бібліятэкі Караль Станіслаў Радзівіл. Гэта пераважна французскія кнігі. Але ёсць і лацінскія, як, напрыклад, львоўскае 1734 г. выданне турэцкага аўтара Дуры эфендзі пра пасольства ад турэцкага султана ў Персію ў перакладзе на лацінскую мову Юды Крусінскага. Траплялі да Радзівілаў кнігі з іншых бібліятэк. Напрыклад, выдадзеная ў 1734 г. у Урбіна кніга Пятра Антонія Мафеі “Esercizj spirituali di Sant’Ignazio Lojola...” мае адзнаку, што належала яна базыльяніну Ясону Смагажэўскаму[9].

Вывучэнне комплексу розначасовых інвентароў радзівілаўскіх бібліятэк, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Беларусі, дало магчымасць Г. Галенчанку

---

[4] Ibid. S. 48-49.

[5] *Series librorum qui bibliothecae in Prussiae Regiae auqmento Radziviliana post editum hujus anno 1673 catalogum novi accessere*. Regiomonti, 1712.

[6] *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси*. Вильно, 1870. Т. 8. С. 417.

[7] У. Сьвяжынскі. Пасьлядоўнік Льва Сапегі. Жыцьцё і мэмуары Альбрыхта Станіслава Радзівіла // *Спадчына*. 1995. № 6 (114). С. 123-169.

[8] Цыт. па: S. Roszak. *Środowisko intelektualne i artystyczne Warszawy w polowie XVIII w. Między kulturą sarmatyzmu i Oświecenia*. Toruń, 1997. S. 51.

[9] S. Havu, I. Lebedeva. *Collections Donated by the Academy of Sciences of St. Petersburg to the Alexander University of Finland in 1829: An Annotated Catalogue*. Helsinki, 1997. № 437.

вылучыць апісанні кнігазбораў Нясвіжскага замка[10]. Значныя кнігазборы Радзівілы мелі таксама ў сваім палацы у Бялай на Падляссі. Маёнтак Бяла пакінуў Мікалаю Радзівілу Сіротку ў 1568 г. Юры Іллініч, спадчыннік Пятра Іванавіча Кішкі. Сын Сіроткі – Аляксандр Людвік Радзівіл пабудаваў тут палац, які сведчыў аб перамяшчэнні інтарэсаў Радзівілаў да цэнтра Рэчы Паспалітай, быў крокам ад родавай рэзідэнцыі ў Нясвіжы да новай сталіцы – Варшавы[11]. Пасля таго, як у 1760 г. Міхал Казімір Рыбанька ад свайго малодшага брата атрымаў у спадчыну Бялу і тытул "графа Бяльскага", ён зрабіў грунтоўны рамонт палаца, рэвізію бібліятэкі, а ўрэшце перанёс кнігі ў Нясвіжскі замак, што значна павялічыла ардынацкую бібліятэку. Частка кнігаў была пераплецена, зроблены цікавыя канвалюты. Адзін з такіх канвалютаў зараз захоўваецца ў Славянскім фондзе Бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук (шыфр XXIX/a5063). У адным пераплёце злучана 12 самастойных выданняў (алігатаў), на кожным з якіх рукой князя напісана "З бібліятэкі маёй маці" ... "KS.X.R."

Апошні з нясвіжскіх ардынатаў – сын Міхала Казіміра Рыбанькі Караль Станіслаў (1734–1790), празваны "Пане Каханку", застаўся адной з самых папулярных асоб свайго часу, героем анекдотаў і рамантычных паданняў. У яго руках было сабранае за стагоддзі багацце ўсёй сям'і – буйнейшая маёмасць у Вялікім Княстве. На набыццё новых кнігаў для бібліятэкі ён штогод выдаткоўваў вялізную суму – 200 злотых. Караль Станіслаў прыняў актыўны ўдзел ў палітычнай барацьбе; яго імя звязана з таямнічай княжной Тараканавай, праз шлюб з якой "Пане Каханку" сур'ёзна разлічваў стаць расійскім манархам. Як вынік палітычных гульняў Караля Станіслава ардынацкая бібліятэка стала расцярушвацца: ўпершыню з родных сценаў частка кнігаў знікла ў 1768 г. у выніку разрабавання замка. "... Падначаленыя разрабавалі арсенал, частку яго запасаў прадалі прусакам, частку пакінулі сабе; у самым жа замку яны не пакінулі ні аднаго дарагога прыбора і аніводнай кнігі ў бібліятэцы", – пісаў Караль Станіслаў у 1772 г. міністру замежных спраў Францыі[12]. У 1772 г. ўся маёмасць Нясвіжа была секвестравана Расійскай дзяржавай. Бібліятэка, сярод іншых каштоўнасцяў, была вывезена з Нясвіжскага замка А. Бібікавым і перададзена Акадэміі навук у Пецярбурзе, у той час калі сам уладальнік знаходзіўся ў вымушанай эміграцыі. Нясвіжская бібліятэка на момант вывазу ў Пецярбург налічвала каля 22 тысяч кнігаў. Па еўрапейскіх мерках гэта быў значны, але не вельмі вялікі кнігазбор. Для параўнання: англійскі натураліст і медык Ганс Слоан (1660–1753) меў бібліятэку, у якой акрамя 40–50 тыс. друкаваных тамоў быў збор гравюр, малюнкаў і карцін і да 4000 рукапісаў[13].

Калі вясной 1775 г. Караль Станіслаў Радзівіл прыняў у Венецыі ад расійскага пасла Отта Магнуса фон Штакельберга шэсць мільёнаў злотых выкупу за канфіскаваныя ў яго ўладаннях каштоўнасці, гэта сведчыла, прынамсі, што

---

[10] Г. Я. Голенченко. Описи библиотек и книжных собраний Радзивилов в Национальном архиве Беларуси // *Badania księgozbiorów Radziwiłłów…* S. 55-61.

[11] J. Baranowski. Pałac w Białej Podlaskiej. Próba rekonstrukcji stanu z XVII w. // *Biuletyn historii sztuki*. 1967. № 1. S. 39-57.

[12] *Korespondencya księcia Karola Stanisława Radziwiłła wojewody wileńskiego "Panie Kochanku" 1762–1790* / Wyd. Kazimierz Waliszewski. Kraków, 1888. S. 83.

[13] J. L. Thornton, R. I. J. Tylly. *Scientific Books*. London, 1971. Pp. 345-346.

Нясвіжская ардынацкая бібліятэка перастала быць дзейным культурным асяродкам на беларускіх землях ВКЛ, а яе гаспадар з гэтым пагадзіўся.

У Нясвіжы пасля 1775 г. пачаў складацца новы кнігазбор, але ён не йшоў у параўнанне з тым, што было страчана (рэшты другога радзівілаўскага кнігазбору знаходзяцца ў Мінску ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, БАН Беларусі[14] і Прэзідэнцкай бібліятэцы[15]).

Тым часам ардынацкая нясвіжская бібліятэка ад жніўня 1772 г. ляжала запакаваная у 94 скрынях у падвалах Акадэміі навук у Пецярбурзе. "Многочисленное собрание книг, хранимое в то время в Несвице, что в Литовском княжестве, перевезено и приобщено к нашему. Дивно, что война, наукам везде зловредная, в России им полезна..." – пісаў бібліятэкар Акадэміі, немец на расійскай службе Іаган Бакмейстэр[16]. Французскі гісторык Кастэра датаваў вываз бібліятэкі 1771 г.: "Сама імператрыца ўдзельнічала ў падзеле здабычы. Славутую бібліятэку князя Радзівіла, скарбонку літоўскай гісторыі, захапілі і адправілі ў Пецярбург; няма сумневу, што яна адтуль больш не вернецца"[17]. Калі з датай Кастэра памыліўся, то меркаванне наконт вяртання гэтага кніжнага скарбу на Радзіму спраўдзілася.

Па распараджэнні Акадэміі навук у цэнтральнай частцы будынка Кунсткамеры, пад вежай, былі зроблены 34 шафы, у якія расклалі нясвіжскія кнігі[18]. І хутка пра іх… забыліся. Падарожны візіцёр у 1791 г. убачыў такі малюнак: "Другое памяшканне, маленькая ратонда, вельмі цёмная, дзе знаходзіцца калекцыя кнігаў Радзівіла, якія таксама зусім занядбаныя, як і тыя, што былі ў першай зале"[19]. Тым не менш у 1801 і 1841 гг. былі складзены каталогі радзівілаўскай бібліятэкі. Карыстаючыся імі, Э. Вальтэр вызначыў, што ў 1772 г. у Пецярбург прывезеныя 9673 назвы кнігаў[20]. У выглядзе асобнага комплексу Нясвіжская бібліятэка не захавалася. Некаторая частка кнігазбору пакінула Акадэмію: у 1813 г. адпраўлена было 1697 назваў (2545 тамоў) дублетаў у Маскоўскі універсітэт для аднаўлення згарэлай бібліятэкі, а ў 1829 г. частка выданняў тэалагічнага і юрыдычнага зместу была падараваная універсітэту ў Хельсінкі[21]. Кнігі на замежных мовах увайшлі ў сістэматычную расстаноўку так званага "бэраўскага" фонду.

У 1882 г. усе выданні на польскай мове, што былі ў бібліятэцы, у тым ліку і са збору Радзівілаў, увайшлі ў склад Славянскага фонду (які праіснаваў да 1930 г., потым быў закрыты, адноўлены ў 1995 г.). Раней, у 1840–1845 гг., польскамоўныя

---

[14] А. В. Стефанович. Книги Радзивиллов … // *Badania księgozbiorów Radziwiłłów*… S. 63-67.

[15] В. М. Герасімаў. Калекцыя "Бібліятэка Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў" у фондах Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь // *Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі*. Менск, 1998. Вып. 3. С. 16-23.

[16] І. Бакмейстер. *Опыт о библіотеке и кабинете редкостей и историі натуральной Санкт-Петербургской императорской Академіи наук*. Санкт-Петербург, 1779. С. 43.

[17] J. Castera. *Historire de Catherine II, impératrice de Russie*. Paris, an VIII [1800]. T. 2. P. 223-224.

[18] *История Библиотеки Академии наук СССР. 1714–1964*. Москва; Ленинград, 1964. С. 138.

[19] *Fortia de Piles. Voyaje de deux français en Allemagne, Danemark, Suede, Russie et Pologne fait en 1790–1792*. Paris, 1796. T. 3. Выказваем падзяку Уладзіміру Сомаву, які паказаў нам на гэтую крыніцу, таксама як і на работу Кастэра.

[20] *Доклады и отчеты Русского библиологического общества 1915–1916 гг.* Петроград, 1917. С. 47.

[21] *История Библиотеки Академии наук СССР*… С. 197.

кнігі Акадэміі навук, у тым ліку Нясвіжскай бібліятэкі (усяго 2636 тамоў), разабраў і апісаў А. Старчэўскі. Ён успамінаў: “Я очутился совершенно в новом мире: передо мною была масса старинных книг, разного достоинства и форматов, хотя кое-где уже погнивших, но это были драгоценные и редкие представители старинной польской литературы и науки, о которых я не имел ни малейшего понятия. Здесь не место распространяться о том, что такое была Несвижская библиотека... Там есть неоцененные сокровища для истории польского права и политической истории Польши XVI и XVII столетий”[22].

У 1914 г. (што супала з падрыхтоўкай да пераезду бібліятэкі ў новы будынак) супрацоўнікі Славянскага аддзела пачалі працы па выяўленні асабліва каштоўных збораў[23]. Важнейшай задачай лічылася рэканструкцыя Нясвіжскай бібліятэкі. Верагодна, менавіта ў той час на некаторых картках алфавітнага каталога Славянскага фонду з’явілася метка “BR”. Па падліках загадчыка Славянскага аддзела Э. Вальтэра, на пачатку XX ст. ва ўсіх фондах Бібліятэкі Акадэміі навук захоўваліся 9673 кнігі з Нясвіжа[24]. Пазней у асобныя фонды адбіралі радзівілаўскія інкунабулы, рэдкія кнігі, карты.

Чарговая кардынальная змена лёсу кнігазбору адбылася ў 1921 г. Непрызнанне на той час Расіяй і Польшчай якіх-небудзь правоў Беларусі прывяло да абмеркавання на савецка-польскай камісіі па выкананні Рыжскай мірнай дамовы амбіцыёзных прэтэнзій абодвух бакоў на каштоўнасці князёў Радзівілаў, між іншым і на бібліятэку[25]. Рэальным вынікам стала тое, што ў БАН раптам зніклі карткавыя каталогі 1801 і 1841 гг.

Ардынацкая бібліятэка мела не менш як шэсць розных экслібрысаў[26], аднак на шмат якія кнігі экслібрысы не былі наклеены. Вызначыць прыналежнасць кнігаў без экслібрысаў да Нясвіжскай бібліятэкі (пры наяўнасці ў БАН фондаў дзесяткаў старых прыватных бібліятэк) – задача, якую ў 1920-я гг. не змаглі вырашыць ні кнігазнаўцы, ні палітыкі ад культуры.

Пазбаўленыя “рэвіндыкацыі” радзівілаўскія кнігі ўратаваліся, воляй лёсу, ад пажару Варшавы пад час Другой сусветнай вайны, у якім згарэла значная частка атрыманых Польшчай паводле Рыжскай дамовы старажытных рукапісаў і кнігаў. Бібліятэку Акадэміі навук чакаў свой страшны пажар у лютым 1988 г. Вызначыць панесеныя страты ад гэтага пажару адразу было проста немагчыма. Прыкладна праз месяц дырэктар бібліятэкі назваў жудасныя лічбы: згарэла каля 400 тысяч кнігаў, каля 3,5 мільёна пры тушэнні пацярпелі ад вады. Пра тое, што сярод згарэлых былі кнігі “из крупнейшей для своего времени частной библиотеки Радзивиллов,

---

22 А. В. Старчевскій. Воспоминанія стараго литератора // *Историческій вестник.* 1888. Октябрь. С. 99.

23 С. Ф. Ольденбург. *Отчет о деятельности Российской Академіи наук по отделеніям физико-математических наук и исторических наук и филологіи за 1916 год.* Петроград, 1916. С. 45.

24 *Доклады и отчеты*... С. 47.

25 Абставіны абмеркавання лёсу радзівілаўскай бібліятэкі адлюстраваныя ў запісах петраградскага бібліятэкара Дз. Шамрая (Аддзел рукапісаў РНБ. Ф. 1105. № 15).

26 W. Wittyg. *Ex-librisy bibliotek polskich XVII i XVIII wieku.* Warszawa, 1903. S. 59; А. В. Стефанович. Экслибрисы библиотеки Несвижской ординации Радзивиллов в фондах ЦНБ НАН Беларуси // *Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі.* Вып. 3. С. 23-31.

складывавшейся на протяжении около двух столетий", першы напісаў акадэмік Дз. Ліхачоў[27]. Потым гэта пацвердзіла газета "Советская культура", змясціўшы фотаздымак з экскаватарам, які разбірае гару попелу ад згарэлых кнігаў вышынёй з двухпавярховы дом[28].

Пасля пажару БАН кнігі з ардынацкай бібліятэкі Радзівілаў захоўваюцца ў розных аддзелах бібліятэкі Расійскай АН (аддзел рэдкіх кнігаў, аддзел картаграфіі, аддзел рукапісаў і Славянскі фонд), таксама ў бібліятэцы Хельсінскага універсітэту (тут выяўлены 820 радзівілаўскіх кнігаў на лацінскай і заходнееўрапейскіх мовах[29]). Невялікая рэшта расцярушана па самых розных сховішчах свету.

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў найбольш актыўна вывучаліся тыя кнігі Нясвіжскай бібліятэкі, якія захоўваліся ў фондах Аддзела рэдкай кнігі Бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук. Рарытэты са славутага кнігазбору былі прадстаўлены на кніжных выставах "Польская книга XVI–XIX вв. в фондах Библиотеки Российской Академии наук" і "Литваника" XVI–XX вв. в собрании Библиотеки Российской Академии наук"[30]. Кнігазбор Радзівілаў працягвае заставацца прадметам навуковага вывучэння расійскіх, польскіх і беларускіх даследчыкаў. Важнай падзеяй стала спецыяльная навуковая канферэнцыя ў Ольштыне, прысвечаная вывучэнню радзівілаўскіх кнігазбораў і выдадзены (намаганнямі перш за ўсё доктара Зоі Ярашэвіч-Пераслаўцаў) зборнік навуковых прац[31]. Апошнім важным крокам стаў двутамовы каталог польскамоўных кніг, падрыхтаваны супрацоўнікамі Славянскага фонду Бібліятэкі Расійскай Акадэміі навук[32].

Нават фрагменты нясвіжскага кнігазбору даюць каштоўную інфармацыю для даследчыкаў. Радзівілы як прадстаўнікі палітычнай эліты свайго часу вялікую ўвагу аддавалі вывучэнню палітычных і прававых сістэм Польшчы і іншых еўрапейскіх дзяржаў, ваеннай справы, сачылі за ходам рэлігійна-палітычных дыскусій, цікавіліся навінкамі і класічнымі творамі мастацкай літаратуры. Экслібрысы і суперэкслібрысы, раскошныя пераплёты, у тым ліку з унікальнымі фігурнымі зашпількамі, кніжныя закладкі (сярод апошніх – тонкай работы выцінанка ў паасобніку "Жыція Госпада і Бога нашаго..." Банавентуры, а таксама маленькія гравюры з выявамі святых, укладзеныя ў некаторыя кнігі) характарызуюць Нясвіжскую бібліятэку як помнік феадальна-замкавай культуры XVI–XVIII ст. Шматлікія прысвячэнні і дароўныя запісы прадстаўнікам роду Радзівілаў дазваляюць пашырыць уяўленне аб культурным і сацыяльна-палітычным значэнні гэтага магнацкага роду ў гісторыі

---

[27] Д. С. Лихачев. Горькие мысли после пожара // *Книжное обозрение*. 1988. 18 марта. С. 16.

[28] В. Потемкин, В. Шварц. До пожара, после пожара... // *Советская культура*. 1988. 28 апреля. С. 6.

[29] S. Havu, I. Lebedeva. *Collections*... Pp. 249-352.

[30] Е. А. Савельева и др. *"Литваника" XVI–XX вв. в собрании Библиотеки Российской Академии наук: Каталог выставки*. Санкт-Петербург, 1997.

[31] *Badania księgozbiorów Radziwiłłów*...

[32] *Собрание польских старопечатных книг в славянском фонде БАН*. Санкт-Петербург, 1999. Вып. 1: Несвижская ординатская библиотека Радзивиллов / Сост. О. В. Гусева, Е. В. Комиссарова. Першы выпуск паўтораны ў 2005 годзе, тады ж выйшаў вып. 2: Собрание польских старопечатных книг в Славянском фонде БАН. Несвижская ординатская библиотека Радзивиллов. Санкт-Петербург, 2005. Вып. 1-2.

ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а наяўнасць багатага (амаль не поўнага) рэпертуару кніжных выданняў друкарняў Рэчы Паспалітай дазваляе паставіць нясвіжскі ардынацкі кнігазбор на ровень нацыянальнай бібліятэкі.

Частка кніжак, якія аселі ў Славянскім фондзе БАН дазволіла нам хаця і вельмі прыкладна, вызначыць працэнт выданняў таго ці іншага гораду Рэчы Паспалітай у нясвіжскай бібліятэцы (гутарка толькі аб выданнях на польскай мове да 1772 году):

| Месца выдання | Колькасць асобнікаў | % ад усіх кніг на польскай мове |
|---|---|---|
| Вільна | 124 | 14,7 |
| Супрасль, Пінск, Слуцк | 31 | 3,4 |
| Нясвіж | 8 | 0,8 |
| S.l. | 102 | 11,2 |
| Kalisz | 47 | 5,1 |
| Lublin | 48 | 5,3 |
| Warszawa | 153 | 16,9 |
| Kraków | 271 | 29,9 |
| Львоў | 74 | 8,1 |

Люблінскія выданні, у тым ліку і некалькі невядомых бібліяграфіі, мы адзначылі ў спецыяльным артыкуле[33]. Зараз каротка прадставім польскамоўныя львоўскія выданні. Усяго іх занатавана 74, з якіх не знайшлося ў даступных нам бібліяграфічных паказальніках, перш за ўсё ў грунтоўнай бібліяграфіі Якіма Запаскі і Яраслава Ісаевіча[34]:

1. Chwała wyznawcy Chrystusowego S. Piotra Regalata, zakonu O. S. Franciszka, pierwszey reformy serafickiey w Krolestwie Hiszpańskim promotora, kanonizowanego od oyca Swiętego papieza Benedykta XIV. Przy festywie teyże kanonizycyi w kośćiołach Oycow Reformatorow ogłoszona Roku Pańskiego 1747. We Lwowie, w drukarni Pawła Jozefa Golczewskiego, J. K. Mości uprzywileiowanego typografa. 1747. [44] с.; 15 см., 8°°. На с. 3–7 1-й пагінацыі прысвячэнне: Wielmozney Jeymci pani z Lipskich Rozy Dziedoszyckiey, chorązyney Trębowelskiey.
2. Gorny, Honorat. Arka pociechy albo godzinki o pocieszeniu Nayświętszey Panny Maryi. Wszystkim wiernym osobliwie w bractwie Paska Rzemiennego zakonu braci eremitow Augustyna Swiętego pocieszenia P. Maryi będącym. Przez Honorata Gornego, doktora Pisma S. tegoż zakonu wydana a teraz świeżo z summaryuszem odpustow pomienionemi bractwu służących przedrukowana w Krakowie 1702, znowu we Lwowie, w drukarni Bracki SSS. Troycy, 1745. [72] с.; 13 см. На адвароце тытульнага аркуша гравюра з выявай Багародзіцы, якую абкружаюць дзеці. У параўнанні з выданнем 1724 г., дададзены гімны і малітвы.

---

33 M. Nikolaev. Druki wydane w Lubline w bibliotekach Radziwiłłów // *Lublin a książka*. Lublin, 2004. S. 235-250.

34 Я. П. Запаско, Я. Д. Ісаєвич. *Пам'ятки книжкового мистецтва. Каталог стародруків, виданих на Україні*. Львів, 1981–1984. Кн. 1-2.

3. Pięc srzod na cześć s. Jana Nepomucena we wszystkim, ále osobliwie dobrey sławy patrona, z godźinkami, litaniami y nabożnemi modlitwami ofiarowane w drukarni Lwowskiey S. J., 1743. [4], 65 с.; 13 см., 12°°. На адвароце тытульнага аркуша гравюра з подпісам: S. Joannes Nepomucen.
4. Pierwsze slady do Zbawienney Drogi prowadzące herbowną podkową wielmoznego imci pana P. Franciszka Zawadzkiego, łowczego Kijowskiego &c. dobrodzieia nayłaskawszego przez heroiczne pobożne postępki utorowane. Do bliszszego poznania Boga y znalezienia, krotkim pytaniem y łatwą Odpowiedzią idące a przez pewnego Kapłana Zakonu Kaznodzieyskiego Konwentu X. generalnego Lwowskiego Bożego Ciała, Prowincyi Ruskiey z Włoskiego Polskim Językiem wyrazony. Roku Pańskiego 1745 Dnia 26. Lutego. We Lwowie, w drukarni Brackiey SSS. Troycy, [1745]. [130] с.; 17 см. На адвароце тытульнага аркуша гравюра з гербам, на с. 3-5 прысвячэнне кіеўскаму лоўчаму Францішку Завадскаму.
5. Swiatło z piąciu gwiazd wynikaiące rożnemi pobożności dewocyami przyozdobione swięty Jan Nepomucen patron dobrey sławy. We Lwowie, w drukarni Collegium Societatis Jesu, Roku Pańskiego 1737. [120] с.; 17 см., 8°°.

Вартыя ўвагі і тыя некалькі паасобнікаў, якія Я. Д. Ісаевіч і Я. П. Запаска ўлічылі па бібліяграфічных спасылках, не бачыўшы de visu:

6. Chmielowski, Joachim Benedykt. Bieg roku całego ná chwałę y część Boga w Troycy Swiętey Jedynego, tákże Niepokalánie Poczętey Pánnie Maryi y wszystkich swiętych przepiędzony, albo modlitwy ná wszystkie swięta uroczyste, y niektore kośćielne, od nabożnych osob obserwowáne iako też y ná inne czasy, także dni osobliwsze w roku przypadaiące, ktore w regestrze znaydźiesz. Przez kápláná swieckiego Joachima Benedykta Chmielowskiego napisany, y za pozwoleniem starszych do druku podany. Teraz zaś iest przedrukowany roku 1742. We Lwo[wie], w druk. Pawła Golczewskiego, 1742. [2], 318, [4] с.: іл.; 13 см., 12°°. Гравюра з Укрыжаваннем на адвароце тыт. арк. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам’яткі... (№ 1428) не названа ні адно месца знаходжання.
7. Chmielowski, Joachim Benedykt. Ucieczka przez Swiętych do Boga, albo Septenny, Nowenny, Decenny &c. pryncypalnieysze y wziętnieysze do Troycy Przenayświętszey, do Matki Nayświętszey, do SS. Aniołow, do SS. Patronow y Patronek w rożnych potrzebach doczesnych y wiecznych zebrane y każdemu dniowi tygodnia akomodowane. Wszystko to de nowo w wielu mieyscach zkomponowane, obiaśnione, poprawione y każdemu nabożnemu do używania przysposobione. Przez Joach. Benedykta Chmielowskiego, kapłana swieckiego. Roku ktorego Bog stał się szystko dla wszystkich 1736. [Lwow]: W drukarni Lwowskiey Soc. Jesu, 1736. [216] с.; 13 см., 12°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам’яткі... (№ 1257) дае няпоўнае апісанне са спасылкай на дэфектны асобнік.
8. Chodykiewicz, Klemens. Zlloty wiek troistego czasu Troycę Boską przybyszowemi latami S. Bazylego Wielkiego patryarchy, biskupa y doktora, od przestępnego czwartego wieku broniący, ostatni sąd świáta, manifestem rożańca w dilacie zatrzymuiący, niebo Polskiemu Krolestwu nieustanną opieką S. Jacka Odrowąża, patrona Korony Polskiey przychylaiący, w troistych herbownych luminarzach łaskawie iaśnieiących Jaśnie Wielmożnego y Nayprzewielebnieyszego Jmci xiędza

Ambrozego Antoniego Turzanskiego, opata y insułata Uniowskiego, zakonu S. Bazylego Wielkiego pokazany. Przez X. Klemensa Chodykiewicza S.T. lektora y aktualnego professora w Kon. Lwowskim S. Magdaleny, zakonu kaznodzieyskiego, Prowincyi Ruskiey. We Lwowie, w drukarni J.K.M. Coll. Soc. Jesu, Roku Pańskiego 1754. [86] с.; 23 см., 4°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1882) налічвае ў гэтым выданні 49 аркушаў, у нашым паасобніку – 86.

9. Chwała Krzyza wielorakiemi łaskami w cudownym Milatynskim ukrzyżowanym Zbawicielu uwielbiona. A tym bardziey w przeswiętnym imieniu Jasnie Wielmozney Jmci pani Karoliny Katarzyny Jasnie Oswieconych xiąząt Jmciow Radziwiłow Rzewuskiey, hrabiny na Olesku y Podhorcach, starosciny Chelmskiey, rotmistrzowey chorągwi pancerney J.K. Mci y R.P. fundatorki y nayosobliwszey dobrodzieyki naszey wsławiona. Od zobligowanych dobroczynnością Pańską WWOO. Karmelitow Bosych Rezydencyi Milatynskiey. Na znak choynego błogosławieństwa Boskiego przy nayglębszey submissyi oddana roku ktorego Krzyż swoiey nabył chwały przez Ukrzyżowanego Zbawiciela 1758. [Leopoli], 1758. [32], 144 с.; 17 см., 8°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 2057) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.

10. Crasset. Zabawy Nabozne, koło Nayswiętszego Sakramentu. Przez xiędza Crasset Jezuite Francuskim językiem wydane y w Warszawie drukowane. A teraz nowo sumptem y rozkázem iedney tegoż Náyświętszego Sakramentu Adorátorki, y náypierwszey Krolestwa Polskiego Jasnie Oswieconey senatorki dla pomnożenia czći Náyświęt. Sakramentu, y pożytku wielu Dusz zá władzą Zwierzchnośći Duchowney przedrukowane. Roku Páńskiego 1747. – We Lwowie w Drukarni Pawła Jozefa Golczewskiego J.K. Mośći Uprzywileiowanego Typografa, [1747]. – [2], 198 с.; 15 см., 8°. На форзацы шыфр БАН і экслібрыс: Ex Bibliotheca Radivilliana Ducali Nesvisiensi. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1601) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.

11. Długosz, Franciszek. Dwor Pana Nieba y Ziemi Bractwo Troycy Przenayswieetszey. Przez X. Franciszka Dllugosza s.th. d. kan. penit. proboszcza bractwa Troycy SSS. kathedralnego Lwowskiego wystawione, a teraz z przydatkiem nowych godzinek rożnych y modlitew według regestru na końcu specyfikowanych. Z pozwoleniem zwierzchności odnowione. We Lwowie, w drukarni SSS. Troycy, Roku Pańskiego 1745. [290] с.: іл.; 14 см., 12°°. Бібліяграфія Запаско Я П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1520) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і паказвае ў гэтым выданні 143 аркушы.

12. Dni piętnascie dnieiącey swiątobliwośćią Jutrzenki, Jaśnie Wielmożnemi imieniami hrabi ná Kodniu y Wisznicy Sapiehy y Anny z hrabiow Krasickich Sapiezyny czesnikow Wielk. Xięstwa Litt. &c. &c. obiasnione, to iest nabozenstwo do s. oyca y patryarchy Dominika fundátorá yakonu kaznodźieyskiego, oraz konfraternij pod tytułem Nayś. Maryi Panny od Zwyćięstwa albo Rożancowey. Ná wzbudzenie ku temu swiętemu gorętszego w wiernych Chrystusowych nabożeństwa, ná piętnaśćie wtorkow rozporządzone. Od stolicy apostolskiey potwierdzone y hoynemi z skárbu Chrystusowego odpustámi nadáne. Za dozwoleniem starszych przy staraniu WW. braći zakonu tegoż przedrukowane, roku ktorego słońce správviedliwośći swiát w grzechach ćiemny oświećiło 1742. We Lwowie, w drukarni Pawła Jozefa

Golczewskiego J.K.M. uprzywil. typografa, 1742. [10], 69 с.; 17 см., 8°°. На адвароце тыт. арк. гравюра-медзярыт з выявай гербоў Сапегаў і Красіцкіх. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1520) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

13. Gorny, Honorat. Arka pociechy albo godzinki o pocieszeniu Nayświętszey Panny Maryi. Wszystkim wiernym osobliwie w bractwie Paska Rzemiennego zakonu braci eremitow Augustyna Swiętego pocieszenia P. Maryi będącym. Przez Honorata Gornego, doktora Pisma S. tegoż zakonu wydana a teraz świeżo z summaryuszem odpustow pomienionemi bractwu służących przedrukowana w Krakowie 1702, znowu we Lwowie, w drukarni Bracki SSS. Troycy, 1745. [72] с.; 13 см. На адвароце тыт. арк. гравюра з выявай Багародцы ў атачэнні дзяцей. У параўнанні з выданнем 1724 г., дададзены сьпевы і малітвы. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1527) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

14. Honoris & Fortunae immortalefaedus inter cellissimum Demetrium S.R. jmperii principem Jabłonowski capitaneum Kovelensem, Visniovensem, &c. & Josepham Mycielska castellanidem Posnaniensem. Cognata regio sangvini nomina, bono publico, Patriae felicitati propositum, a devinctissimo, fundatorio nomini, Collegio Leopoliensi Soc. Jesu, Anno 1748. Leopoli, Typis S.R.M. Collegii Societatis Jesu, [1748]. [78] с.; 35 см. На адвароце тыт. арк. гравіраваны герб і эпіграма. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1638) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

15. Odgłos pienia anielskiego Troycy Przenayswiętszey odzywaiący się do serc wiernych przebiiáiący. Przytym rozne modlitwy y affekty nabożne, odpusty y powinnośći, item Snopek mirry albo Pássya, godźinki o Niepokalánym Poczęćiu Nayś. Panny Maryi, koronká o Nayś. sakramencie, ná większą część y chwalę Boga w Troycy S. Jedynego. Roku 1745. We Lwowie, w drukarni Pawła Jozefa Golczewskiego J.K.M. uprzywilejowanego typografa, 1745. [4], 185, [2] с.: іл.; 13 см., 12°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1536) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

16. Nowenna do swiętego Kajetana prowidencyi Boskiey patrona w każdych potrzebach ludzkich, osobliwie przeciwko plagom Boskim doswiadczonego, ktorego nabożeństwa sam Kajetan swięty, pokazawszy się rożnym osobom, nauczył. Z włoskiego ięzyka na polski przetłumaczona. Nowo za pozwoleniem starszych do druku podana. Przydatkiem nabożeństwa do Piąci Ran Pana Jezusa, godzinek do SS. patronow y koronki o SS. Trzech Krolach. Lwoow, 1740. [120] с.; 16 см., 8°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1384) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

17. Ozdoba całego swiata y kraiow ruskich B. Jan z Dukli przez przystoyne ku czci iego officium y septenny z nabożeństwa oswiadczona y za dozwoleniem starszych do druku podana od braci mnieyszych obserwantow konwentu Lwowskiego. Roku od przywrocenia ozdoby całemu światu wcielonego słowa 1737, 30 mai. We Lwowie, w drukarni Coll. S. Jesu,1737. [72] с.; 13 см., 12°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'ятки... (№ 1291) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.

18. Poboznosc Nowey Hierozolimy albo Názwiskiem polskim zwyczáynym Kalwaryey Pasławskiey w Ruskich kráiách pod Przemyślem świeżo fundowáney. Przy klasztorze y záwiádowániu oycow franciszkanow Conventualium. To iest Sposob Obchodzenia Drog Męki okrutney Chrystusa Iezusa, także drog bolesnych y radosnych Nayświętszey Pánny Matki Bozey Maryey, y insze okolicznośći rożnego nabożeństwá tego mieyyscá świętego. Przez iednego brátá tegoż zakonu opisáne. – W Lwowie, w Druk. M.I. Mośćickiego, F.D. Roku Páńskiego M. DC. LXXI [=1671]. – [2], 88 с.; 15 см., 8°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 498) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.
19. Pobudka szukaiących Boga. Przez rozne nauki Chrystusowe. SS. Mechtyldzie y Giertrudzie obiawione, z kśiąg tychże swiętych wyięte. Przedtym w Poznaniu drukowane, teraz zaś za pozwoleniem Zwierzchności Duchowney, sumptem nie ktorey samego Boga w sprawach swoich zawsze szukaiącey Jasnie Oswieconey pani dla pożytku wielu dusz przedrukowana. – We Lwowie, Roku Pańskiego 1747. – [4], 152 с.; 13 см., 12°. На форзацы стары шыфр БАН і экслібрыс: ...Konstancyi z Radziwiłłow Sapiezyney... 1741. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1614) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.
20. Radkowski, Ludwik. Wirydarz duchowny nowo anyelskiemi liliaami wdzzieecznemi rozzaami sliczno wonnemi ziollkami, rozlicznemi drzewkami od ...Antoniego swiętego na gorze Rodecznickiey sadzony. We Lwowie, Druk. Collegium Societatis Iesu, 1677. [18], [124], [21] с., 1 л. іл. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 552) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка і дае няпоўнае апісанне.
21. Rekrut duchowny kompanij serafickiej, albo Koronka Troycy Przenayswiętszey. Ná wzor y ton Wileński, według komplácencyi fundatorskiey, w Kollegiacie Zołkiewskiey proklamowany. Roku hołduiącego zbáwieniu ludzkiemu Wćielonego Boga 1748, dnia 8. stycznia. We Lwowie, w drukarni Pawła Jozefa Golczewskiego J.K.M. uprzywilejowanego typografa, 1748. 52 с.: іл.;14 см., 12°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1648) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.
22. Szczęsliwosc w rzeczy y w imieniu S. Felicyana męczennika do metropolij Wielkiego Xięstwa Litewskiego po wielu niesczęściach przy solenney ciała jego introdukcyi wprowadzona zu promocyą I. oświeconey xiężny imc Barbary z Zawiszow Radziwiłłowy wojewodziny nowogrodzkiey nayosobliwszey dobrodzieyki y fundatorki w kościele WW. OO. karmelitow dawney obserwancyi konwentu Wileńskiego pod tytułem S. Jerzego Prowincyi Ruskiey deponowana. Roku uszczęśliwionego zbawienia swiata 1750. We Lwowie, w drukarni Brackiey Swiętey Troycy, 1750. [27] с.; 16 см. На адвароце тыт. арк. гравіраваны герб Радзівілаў і чатырохрадкоўе. На с. 3-8 прысвячэнне князёўне Радзівіл. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам'яткі... (№ 1734) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.
23. Thomasz z Akwinu. Anna S. Z Swiętym Joachimem Godnością Wnuka swego Pana Jezusa... Cz. 3: Zamykáiącá w sobie opisánia początkow wsłáwieniá się łáskámi y

cudámi Anny S. W obrázách swoich po rożnych mieyscách w Krolestwie Polskim znáyduiących się. Z pozwoleniem duchowney zwierzchności do druku podana. W Lwowie, w drukarni J.K.M. Jana Filipowicza, J.K.M. uprzywileiowanego typografa, Roku Pańskiego 1756. 96, [2] с.; 17 см., 8°°. Бібліяграфія Запаско Я. П., Ісаевіч Я. Д. Пам’яткі... (№ 1994) не ведае месца знаходжання ніводнага паасобніка.